


# З ЖЫЦЦЯ ЛІТАР

**У сакавіку 2024 года ў выдавецтве «Беларусь» выйшла кніга пад назвай «Жылі-былі літары». Аўтар навінкі наш калега па абласной пісьменніцкай арганізацыі Аляксей Якімовіч (Слонім).**

Нагадаем, што беларускі пісьменнік-педагог Аляксей Якімовіч з'яўляецца сёлетнім лаўрэатам Прэміі Гродзенскага аблвыканкама імя А. І. Дубко за творчыя дасягненні ў сферы культуры і мастацтва.

У кнізе «Жылі-былі літары» сабраны па тры казкі на кожную літару беларускага алфавіта. Іх галоўныя героі – хлопчыкі Міколка і Васілёк, Сінічка і Верабейка, чорны мураш Чарныш і рыжы мураш Рыжык.

Аляксей Мікалаевіч Якімовіч – ветэран педагагічнай працы, празаік, паэт, публіцыст, драматург. Аўтар больш за 6 дзясяткаў кніг. Плённа супрацоўнічае з шэрагам дзяржаўных кніжных выдавецтваў, сярод якіх «Пачатковая школа», «Мастацкая літаратура», «Звязда», «Беларусь», «Народная асвета» і іншыя. Піша для дзяцей, падлеткаў і дарослых. Прайшоў шлях ад настаўніка пачатковых класаў да дырэктара школы. Яго творы для самых маленькіх чытачоў з’яўляюцца карыснымі сродкамі выхавання моладзі, фарміравання сістэмы маральных каштоўнасцей і духоўна-інтэлектуальнага патэнцыялу юных беларусаў. Новае выданне нашага калегі – кнігу для маленькіх чытачоў, іх бацькоў і настаўнікаў «Жылі-былі літары» пытайцеся ў кнігарнях і бібліятэках.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**



Аляксей Якімовіч. **Пра аўтара**